

*Узнагароджанне Вячаслава Калацэя Ганаровым знакам БФК «Руплівцу. Стваральніку»*

# На тым тыдні...

## *Ратуемся спадчынай*

✓11 – 12 кастрычніка адбыўся ў рэжыме анлайн Міжнародны культурны форум «Расія – Беларусь: духоўная прастора і мастацтва – гісторыя і сучаснасць». Пад час секцыйнага пасяджэння **12 кастрычніка** ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры прайшло **ўшанаванне** вядомага беларускага культуролага, этнафонaзнаўца, сябра Рады Беларускага фонду культуры **Вячаслава Калацэя** ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння, які быў узнагароджаны Ганаровым знакам БФК «Руплівцу. Стваральніку» за шматгадовую плённую дзейнасць па адраджэнні і папулярызацыі традыцыйнай культуры Беларусі.

✓**13 кастрычніка** ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Д. Шчамялёва адкрылася персанальная выстава амерыканскага архітэктара, дызайнера Ількера Каджахана **«Hand drawings. Архитектура из Нью-Йорка в Минске»**.

На выставе прадстаўлена больш як 50 прац у галіне архітэктурнага канцэптуальнага дызайну, інтэр'еру і экстэр'еру, а таксама мастацкай акварэлі, якія вылучаюцца прадуманасцю і дакладнасцю дэталяў. І. Каджахан не выкарыстоўвае камп'ютарныя тэхналогіі, усё малюе ад рукі, што робіць унікальным кожны яго праект.

Выстава працуе да 14 лістапада.

✓У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь **14 кастрычніка** пачала працу фотавыстава **«Матуліны колеры»**, якая дэманструе народныя строі ўсіх этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Выстава прымеркаваная да Дня маці.

Першае і самае прыгожае, што мы бачым – матуліны вочы. Потым матулі адкрываюць нам цэлы свет, натхняюць на лепшае, імкнуцца атуліць нас цяплом і пяшчотай свайго сэрца, а таксама прыгажосцю рукатворнай. Эстэтыка і каларыстыка народнога строю перадае ўяўленні пра гэтую прыгажосць ад нашых матуляў цягам стагоддзяў.

Выстава – гэта пра цуд, створаны рукамі жанчынаў, які адлюстроўвае вытанчаны і тактоўны густ. Ткацтва – складаны тэхнічны і бязмежны творчы працэс. Спалучэнні колераў, іх адценняў, арнаментаў нараджаюць непаўторныя рэчы, утылітарнасць якіх адыходзіць на другі план, адкрываючы мастацкую, эстэтычную, гістарычную каштоўнасць.

Экспануюцца 13 выяваў беларускіх строяў. Вылучаны шэраг колераў, якія пазначаны з дапамогай самых папулярных колеравых мадэляў: RGBiCMYK, каб было зручней імі карыстацца ў лічбавай прасторы. Тут выкарыстаныя фотаздымкі калекцыі «Беларускае народнае адзенне» са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Фатографы: Яўген Грабкін, Аляксандр Аляксееў, Алег Лукашэвіч (Аляксандр і Алег – сябры Беларускага фонду культуры).

✓**15 кастрычніка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў межах выставы «Жыццё ў колеры. Святло ў нашым жыцці» адбылася **творчая сустрэча з Анастасіяй Балыш**. Яна – мастачка, ілюстратарка і актыўны грамадскі дзеяч. «Натхненню нельга адмаўляць!» – нязменны дэвіз Анастасіі. Пад час сустрэчы адбылася прэзентацыя кнігі Т. Дамаранак «Караблі, моры і акіяны» з ілюстрацыямі А. Балыш. Таксама мастачка правяла майстар-клас у тэхніцы арыгамі «Папяровы караблік».

Аўтар – член ТГА «Мастак» і МГА «Еўразійская мастацкая садружнасць», кіраўнік праваслаўнага культурнага цэнтра святапакутніка Парфірыя Заслаўскага, куратар Міжнароднага мастацкага пленэру «Заслаўскі Спас». Карціны Анастасіі знаходзяцца ў калекцыі «TearsofHappiness» (UK, Oxford, UniversityCollege, MCR); у Мядзельскім музеі народнай славы; у музеі-запаведніку «Заслаўе» і ў Аршанскім музеі У.С. Караткевіча; у прыватных калекцыях Беларусі, Расіі, Галандыі, Аўстраліі, Чэхіі, Англіі, Казахстана, Фінляндыі, Ізраіля і інш.

Тут жа **16 кастрычніка** адбылася лекцыя кандыдата мастацтвазнаўства Наталлі Царык **«Цветовосприятие в живописи»**, дзе слухачы азнаёміліся з рознымі аспектамі ўздзеяння колеру на чалавека.

*Скарыстаныя паведамленні Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Д. Шчамялёва, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, мастацкай галерэі «Універсітэт культуры»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ